**К. Кузьміч**

# ХАЛАКОСТ У МУЗЕЙНЫМ ДЫСКУРСЕ (на прыкладзе музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і анлайн-экспазіцыі Яд Вашэм)

Чым далей падзеі Другой сусветнай вайны сыходзяць у мінулае, тым больш прыкметную ролю ў фарміраванні калектыўнай памяці пра яе граюць музеі і мемарыялы. Яны нясуць памяць аб мінулым у адпаведнасці з самымі разнастайнымі нацыянальнымі міфамі і палітычнымі ідэалогіямі.

**Халакост** – найважнейшая частка вайны. Паміж 1941 і 1945 гг. нацысты імкнуліся знішчыць усю габрэйскую супольнасць Еўропы. Іх забівалі эскадроны смерці, так званыя айнзацгрупы, або адпраўлялі ў лагеры знішчэння. Шэсць з адзінаццаці мільёнаў габрэяў загінулі. Таму для даследвання

пытання памяці Халакосту мы вырашылі прааналізаваць тое, як захоўваецца памяць пра Халакост у музеях. Былі выбраны 2 музея: Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і музей Халакосту Яд Вашэм.

***Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны*** прысвечаны барацьбе беларускага народа з нямецка-фашысцкімі акупантамі. У ім размешчана 10 тэматычных экспазіцыйных залаў, і тэму знішчэння габрэяў можна паспрабаваць знайсці ў невялікай інсталяцыі, прысвечанай Трасцянцу, дзе таксама дакладна не даецца інфармацыі менавіта пра гэты народ. Даецца таксама невялікая даведка пра тое, што Трасцянец – найбуйнейшы лагер смерці на тэрыторыі СССР, што колькасць загінулых – 206 500 чалавек, што былі забіты і пахаваны грамадзяне Аўстрыі, Чэхіі, Германіі і Польшчы і самога СССР. Ёсць візуалізацыя лагера, ёсць няшмат асабістых рэчаў, няма дакладнай інфармацыі пра дыферэнцыяцыю вязняў, няма асабістых гісторый, што не дазваляе паглыбіцца і зразумець важнасць праблемы.

У музеі Яд Вашэм ёсць 10 тэматычных галярэй, кожная з якіх прысвечана пэўнаму этапу Халакоста. Паказана, як складалася жыццё габрэяў да, падчас і пасля вайны. Дзякуючы вялікай колькасці матэрыялаў, звестак пра загінулых, пра ўмовы іх існавання ў лагерах, пра асабістыя пачуцці, якія яны паспелі пакінуць, ствараецца атмасфера, якая дазваляе ўбачыць лёс асобнага чалавека. У анлайн экспазіцыі Яд Вашэм на сённяшні дзень ёсць 5 калекцый, таксама па розных тэмах:

праведнікі народаў свету;

- лёс людзей, якія жылі ў 19 кіламетрах ад Аўшвіца;
- ратаванне немцам габрэяў, якіх выкарыстоўвалі як працоўную сілу;
- дзіцячая трагедыя, як дзеці ратавалі сябе і вярталіся да жыцця пасля вайны;
- гісторыі ратавання дзвюх габрэйскіх дзяўчын жыхарамі Вільнюса.

Такім чынам, мы прыйшлі да высновы, што існуе вялікая розніца паміж экспазіцыямі па зместу і напоўненасці; у музеі Яд Вашэм Халакост – цэнтральная і асноўная тэма, у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны – Халакост не ўпамінаецца, нягледзячы на тое, што перад вайной у Мінску габрэйскае насельніцтва складала ледзь не палову. Амаль кожная сям’я страціла родных на вайне, але ёсць розніца, паміж тым, каб памерці са зброяй у руках і быць знішчаным, калі не можаш абараніць сябе; і важна памятаць, што каштоўнасць чалавечага жыцця не вымяраецца нацыянальнасцю.